**А. А. Хмелянок,**
*лабарант кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства*
*БДУ культуры і мастацтваў*

# ПАНТЭОН ВЯРХОЎНЫХ БАГОЎ БЕЛАРУСКАЙ МІФАЛОГІІ Ў ІНДАЕЎРАПЕЙСКІХ ПАРАЛЕЛЯХ: СЕМАНТЫКА-ФУНКЦЫЯНАЛЬНЫЯ ЗНАЧЭННІ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Спецыфіка светаўспрымання старажытных народаў грунтуецца на суадносінах навакольнага асяроддзя з чалавекам, яго жыццём і дзейнасцю. Шэраг старажытных тэкстаў, напрыклад законы Ману, змяшчаюць у сабе вялікую колькасць парад, накіраваных на тое, каб захаваць прыроду ў культурнай прасторы старажытных цывілізацый. Адным з вызначальных фактараў старажытных культур з’яўляецца пакланенне сонцу, якое бярэ свой пачатак ад неалітычнай рэвалюцыі і захавалася ў фальклорным мастацтве да нашых дзён.

Станаўленне салярнасці прайшло складаны шлях развіцця: ад пакланення сонечнаму дыску да персаніфікацыі розных адценняў сонца ў гадавым прыродным цыкле. Згодна даследаванням Б.Рыбакова, найбольш позняй персаніфікацыяй сонечнага бажаства славянскага пантэона лічыцца Ярыла, які, у сваю чаргу, мае даволі складаную функцыянальную нагрузку, звязаную з культам плоднасці. На гэта ўказваюць фалічныя абрады, звязаныя са штогадовым “пахаваннем Ярылы”, якія дажылі да канца XIX ст. і зафіксаваны шматлікімі этнографамі.

Па сваіх рысах культ Ярылы ўяшляецца даволі блізкім да распаўсюджаных у старажытнасці культаў паміраючага і ўваскрасаючага бажаства плоднасці, новай веснавой пладаноснай моцы, што нагадвае антычны культ бога Дыяніса. Дадзеная традыцыя прасочваецца і ў іншых культурах. Так, напрыклад, змену пор года егіпцяне суадносілі з богам Асірысам. Такі міфалагічны матыў быў знаёмы і прадстаўнікам старажытна-індыйскай традыцыі. Неабходна адзначыць і такі момант: матыў паміраючага і ўваскрасаючага бога старажытныя індыйцы суадносілі не толькі з культам плоднасці. Яны лічылі, што ў момант памірання (засынання) бога Вішну-Нараяны Сусвет знішчаецца, у полымі агню сціскаецца да вельмі малых памераў; а акт тварэння сусветнай касмічнай прасторы адбываўся ў момант нараджэння

(абуджэння). Усё гэта дае магчымасць датаваць час з’яўлення культа Ярылы эпохай рассялення славян у VI ст. н. э.

У ведыйскай літаратуры Вішну выступае перш за ўсё, як персаніфікацыя нябеснай, светлавой, сонечнай энергіі. На суадносіны Вішну з сонечнай міфалогіяй указвае і той момант, што ён захавальнік Сусвету, уладар касмічнай прасторы і родны брат бога сонца Сур’і. Веды прыпісваюць яму і асноўныя касмалагічныя дзеянні.

У Індыі даволі шырока вядомы міф пра тры крокі бога Вішну, якія многія даследчыкі звязваюць з трыма галоўнымі пунктамі сонечнага шляху: усход, поўдзень і захад [2, с. 140]. Існуе меркаванне, што Вішну ўвасабляе гадавы шлях поўнага месяца, ён стваральнік яго арбіты; што тры яго крокі ёсць не што іншае, як “дзяленне задыяка на тры часткі ці вялікага года на дзве паловы па шэсць месяцаў і трэці – дадатковы – з аднаго месяца” [3, с. 46].

Даволі складана знайсці апісанне знешнасці дадзенага бажаства. Згодна з даследаваннямі І.К.Цішчанкі, Ярыла паўстае ў вобліку юнака з вянком, сплеценым з веснавых кветак, на русай курчавай галаве. Даволі часта ён у левай руцэ трымаў з пукам каласоў збожжа. Па вераваннях усходнеславянскіх народаў, Ярыла, апрануты ў белае адзенне, на белым кані аб’язджаў ніву [6, с. 91]. Некаторыя яго рысы прасочваюцца ў тэатралізаваных абрадавых дзеяннях.

У архіве вядомага этнографа П. Шпілеўскага захавалася апісанне беларускага свята ў гонар Ярылы. Выбіралі дзяўчыну, апраналі яе ў белае адзенне, на галаву надзявалі вянок з кветак і садзілі на белага каня, прывязанага да слупа. Вакол іх дзяўчаты ў вянках вадзілі карагоды (часам на ніве) і спявалі песні пра Ярылу як захавальніка плоднасці (не толькі раслiннай, але і чалавечай) [1, с. 578].

Ва ўяўленнях старажытных славян Ярыла быў богам пладоў, ураджайнасці і ўвогуле плоднасці ва ўсіх яе выявах, пачынаючы з раслін і жывёлы і заканчваючы чалавекам. Бажаство адказвала за веснавое адраджэнне прыроды, таму даволі часта яго параўноўваюць з аратым. У працах некаторых даследчыкаў яго называюць Арыем, сынам вярхоўнага бога. Ён быў тым бажаством, якое давала жыццё на зямлі ўсяму жывому. Сведчаннем таго, што культ дадзенага бажаства суадносіцца з пладаноснай моцай адноўленай прыроды, з’яўляецца той факт, што святкаванне ў гонар Ярылы на працягу доўгага часу праводзілася вясной.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Веснавая абраднасць мела заклінальны сэнс, таму “пахаванне Ярылы”, якое праводзілася ў дзень летняга сонцастаяння, адлюстроўвае найбольш важны момант земляробства: поўнае адміранне зерня, якое кінулі ў зямлю вясной, і высяванне новага зерня на каласах новага ўраджаю [4, с. 420]. Сутнасць абраду зводзіцца да таго, што збожжа ўжо пачало каласіцца, пасеянае зерне нарадзіла новы ўраджай, і, магчыма, моц Ярылы была непатрэбна, і лялька, якая сімвалізавала яго, хавалася весела, з непрыстойнымі жартамі і прытворным плачам.

Спецыфіка абраду дае магчымасць меркаваць, што рытуальнае ахвярапрынашэнне сваімі каранямі адносіцца да далёкай старажытнасці, яно павінна было спрыяць выспяванню багатага ўраджаю і захаванню рэпрадукцыйнай сілы зерня на наступны год. Тут неабходна ўспомніць Вішну, які перш-наперш звязаны з салярнай міфалогіяй, аднак яго таксама разглядаюць у сувязі з містычнай інтэрпрэтацыяй абраду ахвярапрынашэння. Магчыма, менавіта гэта можна разглядаць як ахоўную здольнасць прыроды на чале з сонцам у адносінах да свету.

Ярыла як асноўнае сонечнае бажаство на працягу гадавога цыкла праходзіць некаторыя стадыі персаніфікацыі, якія ўвасабляюць назапашванне моцы сонечнай энергіі. У гэтым сэнсе самае слабае зімовае сонца называецца Калядой. Дадзеная персаніфікацыя суадносіцца з момантам нараджэння новага сонца, якое ў міфалагічнай традыцыі носіць імя Дажбога.

Даволі складана даць этымалагічнае тлумачэнне тэрміна “каляда”, які замацаваўся ва ўсходнеславянскай міфалогіі. З аднаго боку, гэта комплекс зімовых навагодніх абрадаў, які з часоў старажытнасці ўвабраў усе рысы абрадаў “пачатку” новага гадавога цыкла; а з другога – назва ежы, прыгатаванай да гэтага свята, што паказвае на цесную сувязь яе з ахвярапрынашэннем. Зразумела, што як свята пачатку года Каляды адносяцца да ліку абрадаў салярнага культу, рытуальныя дзеянні якога былі прымеркаваныя да дня зімовага сонцавароту як пераходнай мяжы паміж зімовымі маразамі і веснавой палявой працай. Увесь шэраг рытуальных дзеянняў быў скіраваны на тое, каб удыхнуць новую жыццёвую сілу слабаму зімоваму сонцу, якое па меры яе назапашвання будзе саграваць зямлю. З іншага боку, гэта – спроба накіраваць прыродныя цыклы ў патрэбны для земляробства бок.

Дыяметральнай супрацьлегласцю выступае летняе сонца, якое называецца Купалам. Дадзеная персаніфікацыя заключае ў сабе

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўсю моц, назапашаную на працягу зімова-веснавога перыяду, якая неабходна для канчатковага выспявання будучага ўраджаю.

Купалле – старажытнае каляндарнае свята, што праводзілася падчас дня летняга сонцавароту. Гэты час адзначаецца найвялікшай сонечнай актыўнасцю ў гадавым цыкле, а таксама найбольш поўным росквітам пладаносных сіл зямлі. Паходжанне слова "купала" сваімі каранямі сягае ў індаеўрапейскую традыцыю і суадносіцца са словамі "кіпець", "пламенно жаждать". Суадносіцца яно і з пэўнымі марфемамі лацінскай традыцыі. Пры больш грунтоўным семантычным аналізе прасочваецца сувязь усяго абраду з агнём (які сышоў з неба на зямлю, што прадстаўлена ў абрадавым дзеянні вогнішчам, запаленым колам, папараццю-кветкай) і вадой, а таксама пачуццёвай напоўненасцю.

Святочная ноч мела асаблівае значэнне ў сялянскім гадавым календары, таму рыхтавацца да яе пачыналі загадзя. Жывы агонь здабывалі шляхам трэння кавалкаў дрэва. Як сімвал Сонца ўздымалі на жардзіне запаленае кола. Лічылася, што полымя святочнага агню набывала ачышчальную моц, выратоўвала ад смерці і розных хвароб. Зыходзячы з гэтага можна выказаць меркаванне аб праяўленні захоўваючай функцыі сонца ў адносінах да ўсяго свету, якая ўвасобілася ў купальскім вогнішчы.

Адным з найбольш загадкавых сімвалаў, спадарожных летняму сонцу, з'яўляецца кветка папараці. Згодна ўсходнеславянскай міфалогіі, толькі адзін раз у год, ноччу, на яе зыходзіць нябесны агонь Перуна (бога грома і маланкі), і яна цвіце адно імгненне яркім полымем. Завалодаць папараць-кветкай – значыць даведацца пра тайны быцця, яго багацце і паўнату. Магчыма, гэтая магічная кветка ў славянскай міфалогіі была раўназначнай біблейскаму райскаму яблыку як сімвалу канцэнтрацыі ведаў пра ўсе законы Сусвету, што з'яўляецца сімвалам недасягальнасці для простага чалавека палымянай кветкі.

Такім чынам, эвалюцыя салярных уяўленняў прайшла складаны шлях і ўвасобіла ўвесь гадавы сонечны цыкл, на чым да нашых дзён грунтуецца земляробчы каляндар і абраднасць.

1. *Беларуская* міфалогія: энцыклапед. слоўнік. – 2-е выд., дап. – Мн.: Беларусь, 2006. – 599 с.: іл.

2. *Гусева, Н. Р.* Славяне и арьи. Путь богов и слов / Н.Р.Гусева. – М.: ФАИР-ПРЕСС, 2002. – 336 с.: ил.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. *Михайлов, М. И.* Ключ к Ведам: в 3 т. / М.И.Михайлов, Н. С. Михайлова; пер. с санскрита 8-й гл. «Чхандах-шастры» Пингалы и комментарии. Минск; Вильнюс; Санкт-Петербург, 2004. Ч. 2: Тайные числовые коды хронокомпьютера. – 352 с.: ил.

4. *Рыбаков, Б.А.* Язычество древних славян / Б. А. Рыбаков. – М.: Наука, 1981. – 606 с: ил.

5. *Цішчанка, І. К.* З творчай спадчыны: навук. арт., літ. тв. / І. К. Цішчанка. – Мн.: Бел. кнігазбор, 2004. – 288 с

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ